МІНСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
220030, г. Мінск, вул. Энгельса, 4
тэл. 327-03-07, факс 327-24-15
E-mail: pisma@minsk-region.gov.by

МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
220030, г. Минск, ул. Энгельса, 4
тел. 327-03-07, факс 327-24-15
E-mail: pisma@minsk-region.gov.by

05.10.2020 № 11.2-6/4/2527-с
11.2-6/4/2527 с/1

на №

(для інфармавання зацікаўленых)

Аб прынятых мерах

Мінскі абласны выканаўчы камітэт разгледзеў Вашы звароты адносна нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Комплекс старых праваслаўных могілак» у аг. Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобласці паведамляе наступнае.

З мэтай выканання патрабаванняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь пры ажыццяўленні дзейнасці на тэрыторыі матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Мінскім аблвыканкамам быў распрацаваны і зацверджаны комплексны план мерапрыемстваў па захаванню і прывядзенню ў належны стан гісторыка-культурных каштоўнасцей аг. Ракаў Валожынскага раёна на 2020 – 2021 гг. Згодна з планам былі праведзены наступныя мерапрыемствы.

Дапрацаваны з улікам патрабаванняў артыкула 100 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс аб культуры) пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці «Комплекс старых праваслаўных могілак» у аг. Ракаў і накіраваны адзін асобнік у адрас Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Унесены змяненні і дапаўненні, у тым ліку індывідуальныя ўмовы ўтрымання і выкарыстання, у ахоўныя абавязацельствы на гісторыка-культурную каштоўнасць «Комплекс старых праваслаўных могілак» згодна з артыкулам 121 Кодэкса аб культуры. Уласнікам (дырэктарам РУП «Валожынскі жылкамунгас») падпісаны ахоўныя абавязацельствы ад 01.09.2020 № 6-3/3-5/38, звесткі накіраваны ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Фінансавыя сродкі на карэкціроўку праекта зоны аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей аг. Ракаў будуць запланавы РУП «Валожынскі жылкамунгас» на першае паўгоддзе 2021 года.

У ліпені 2020 г. праведзена інвентарызацыя пахаванняў на Комплексе старых праваслаўных могілах у аг. Ракаў, па выніках якой складзены акт інвентарызацыі на 7 000 пахаванняў. Рыхтуецца рашэнне Валожынскага райвыканкама па стварэнні камісіі для зацвярджэння дадзенага акта.

У адпаведнасці з пунктам 5 артыкула 104 Кодэкса аб культуры ў ліпені 2020 г. на браме могілак устаноўлена новая ахоўная дошка гісторыка-культурнай каштоўнасці «Комплекс старых праваслаўных могілак».

У жніўні 2020 г. праведзены работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі Комплекса старых праваслаўных могілак у аг. Ракаў: высечаны хмызняк, праведзена пакоска тэрыторыі.

Працягваецца работа па выкананню пунктаў 4, 6, 8 дадзенага плана. Аб выніках будзе паведамлена дадаткова.

Дадзены адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым часткай першай пункта 1 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращении граждан и юридических лиц».

Намеснік старшыні І.С.Маркевіч

Мамчанка 517 52 59